Беларускі Шлях

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
…рпухоуская вул. д. № 12

…акцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
…іністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

…акцыя пакідае за сабой права па… …уляць перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру…
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

…60. Менск. Чацьвер 6 чэрвеня 1918 г. Год I

Менск 6/1г.

…рганізацыя новаго складу …однаго Сэкрэтарыяту часо… …замарудзілася дзеля ад'езду …адзяніна Р. Скірмунта, ка… …ы дзеля споунення важнай …ітычнай місеіі удаўся на …аіну,

…тары склад Народнаго Сэк… …рыяту працуе мэханічно у …акані павіннай наступіць …ены.

…ажны крок у кірунку рэ… …анізацыі Беларускай Улады …ім чынам іщчэ нізакончаны …ты пераходны стан адбіва… …а і на унешнім абліччу бе… …ускай справы. Можа зда… …ца што яна знайходзіцца у …нэ нейкаго затрымания.

…у самой рэчы справа Бела… …кай дзержаунасьці падняла… …цяпер на такі высокі сту… …ь на якім яна іщчэ бадай …о і ні стала.

…Што найважнейшае, узмоц… …цца не грунт у правінцыі.

…Вялікі край ні можа жыць …дзержаунаго ладу. Разам …ым беларусам наусюдах да… …лі вялікарускія і польскія …куны, асабліва пасьля на… …аных імі у апошнія часы …обові і спагаднасьці».

…Беларусь стыхійна цягнецца …дзержаунаго цэнтру—Рады …д не чакае ладу і помачы. …Стыхійны пацяг гэты дай… …у цяпер да такой жа высо… …ьці, калі ні большай, як …ад першым конгрэссам.

…і яму трэба своечасно вы… …ца у супольнай агульнай …рчасьці новаго жыцця. Трэ… …валаджываць грамадзкі быт, …зпечыушы яго пэуным за… …одаустcovом выцекаючым с …удзівых, ужо вызрэушых і …ячых на часе патрэб.

…Цягнуць доуга з гэтай спра… …о ні можна, бо можа пай… …і умысловая рэакцыя, като… …і зноу кіне беларускае гра… …дзянство у атхланне безна… …йнай ніяковасьці да агуль… …х справау.

…Перад новым Урадам калі …аканчацельна сфарміруецца …рыто поле жывой, кіпучай, …рчай працы.

…Аднак і цяперашні Урад …біу на астатніх днях важны …ітычны крок, умешаушыся у украінска-вялікарускія мірныя перагаворы. Важным актам належыць лічыць наведзіны беларускай дэлегацыяй украінскаго міністра заграничных справау, вынікам чаго была пастанова Украінскаго Ураду бараніць пры мірных перагаворах жыццевыя інтарэсы Беларусі.

Так сама важным з'яуляецца і уручэнне ноты да савецкаго Ураду старшыне рускай мірнай дэлегацыі Ракоускаму.

Амаль ні з пэунасьцю можна спадзявацца, што нота пажаданых скуткау ні дасьць, бо савецкі урад ні меу да гэтаго часу звычаю так легка рэаговаць на праявы самаазначэння злучэных дауней з Вялікаросіяй народау, але значэнне гэтаго акту у тым, што Беларускі Урад у першы раз праз упаважненую ім дэлегацыю афіцыяльна зьвярнууся да савецкаго Ураду Вялікаросіі і тым палажыу пачатак дыплематычных стасункау. Як пойдуць гэтыя стасункі далей—пакажа будучына, каторай, мы пэуны, ні доуга чакаць.

Агульныя вестkі.

БЭРЛІН (В.Т.Б.) Доказам поунаго перапуду, вызваннаго ў французаў нашым наступленнем, служаць вялізарныя склады, пакіненыя цэлымі ўцекаючымі ворагамі. Калі дзіўна здаецца, што на аэродромах пакінено многа зусім цэлых самалётаў, дык асабліва нізразумело тое, што ўцекаўшыя французы ні пасьпелі зніштожыць вялізарныя склады запасаў.

БЭРЛІН [В.Т.Б.] Пасьля заняцця намі поўночнае часьці Шато-Т'еры і Вэрнэй фронт на Марне дайшоў больш за 20 кілёмэтраў у шыркі. Вузкі клін абярнуўся ў шырокую фронтовую базу.

ЛОНДОН. Грамадзянство вельмі ўстрывожэно здарэннямі на захадпім фронце. Газэты падчорківаюць добрае налажэнне немцаў, каторыя маюць свабоду дзеянняў і могуць нападаць у якім хочуць кірунку, вядучы наступленне: на порты канала Ляманш, або на Ам'ен, або на Парыж. Лёрд Сэсіль меў па правінцыі мову у каторай паказаў на вельмі сур'эзнае палажэнне. С 1914 году палажэнне нікол і ні было болей нібаспечным. Аднак ен спадзяецца на адвагу салдатоў.

ЖЭНЭВА. Газэты паказываюць, што ў часе падарожы на фронт самаходам, у якім ехаў Клемансо і міністэр Фавр, здарылося нішчасьце. Абодва цяжка ранены; патрэбна апэрацыя.

БЭРН [В.Т.Б.] Пастаянны камітэт сінн-фэйнэраў паслаў у англіцкія газэты гэткі пратэст:

«Мы цьвёрда пратэстуем проці гвалтаў над арэштованымі ў тым тыдні нашымі таварышамі, аб каторых свяком іх ні кажуць, дзе яны знаходзяцца. Мы зьвертаем увагу урадаў Эўропы і Амэрыкі на тое, што ірляндцы прасьледуюцца так званымі «ваякамі за волю малых народаў».

БЭРЛІН [В.Т.Б.] 30 мая ідучы на перадзі сваіх пабедных войск ніўдалёчку ад Марны, забіт прынц Бухаў, начальнік аднэй дывізіі, каторая ад 27 да 29 мая ў безупынных бітвах у дзень і ў начы прайшла 60 кілём., здабыла 12 батарэй с 60 гарматамі і ўзяла да 3600 палонных.

БАЗЭЛЬ. «Тімес» паказывае с Торрэнто:

У Галіфаксе узьняўся бунт, калі была зроблена спроба арэштаваць двох салдатаў і матросаў. Таўпа прабавала падпаліць ратушу намочэнай у газу саломай і перарэзала пажарніскія трубы. Аднак пажар удалося затушыць.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ. 2. VI. У поўнач пазаўчора у Стамбулі узьняўся вялізарны пажар, затушэны толькі ўчора. С прычыны цеснаты у дрэўляных кварталах згарэло многа магамэтанскіх дамоў. У тушэнні пажару прынімалі учасьце аўстрыяцкія і нямецкія войскі. Ваенны міністэр сам кіраваў тушэннем.

БЭРН. Поўофіцыязна апавяшчаецца, што французкі урад цьвёрда загадаў паліцыі безміласэрдна караць усіх, хто будзе шырыць весткі аб ваенных здарэннях, вызываючыя паніку.

ЖЭНЭВА. У парыжскім прадмесьці С.-Дэні ў 5-гадзінным пажары згарэла да тла фабрыка ваенных матэр'ялаў.

КІЕЎ. На апошнім заседанні мірнай конфэрэнцыі Раковскі заявіў:

«Украіна ні мае іщчэ поўных юрыдычных правоў і ні прызнана, як такая, савецкай рэспублікай. Савецкі ўрад—гэта законны насьледнік быўшае Расійскае дзержавы, ды толькі са згодай яго паадзінокія часьці быўшае Расіі могуць выступаць, як насіцелі міжнароднаго права. Савецкі ўрад, аднак, прызнае права Украіны на самаазначэнне».

Уцёкшы з вялікімі грашыма б. міністэр сельскай гаспадаркі арэштован на дачы пры Вінічэсцы і перавезен у Кіеў.

БЭРЛІН. Гішпанскі пасол паказывае, што чуткі аб пашыранай бытцым то ў Гішпаніі эпідэміі лішна пав'лічэны. Справа ў тым, што тут вельмі пашырылася трасца, якая трывае тры дні і пасьля сама сабой праходзіць. Ніхто ад яе ні памёр.

ГЭЛЬСІНГФОРС. Генэрал Маннэргэйм выйшаў у адстаўку с пэнсіей 30.000 марак.

ГААГА, 1/VI. Як газэта «Нів. Курант.» пазнае з Лёндану, два выпадкі хвароб, на адным параходзе у Трэвсенд аказаліся чумою. Уезд у гавань параходу забароняны. Пэўна мышы аказываюцца прычынай хваробаў.

ФРАНКФУРТ на МАЙНЕ, 1/VI. «Матэн» паведамляе з Мадрыда, што здароўе гішпонскаго караля палепшылося і што у хуткім часе зусім паправіцца.

ВАРШАВА. Член Рэгенцкай Рады Юзэф Островскі занедужаў.

Дзеля паважнаго веку хвораго стан яго будзіць ніспакой.

БАЗЭЛЬ, 3/VI. «Журнал дэ Дэба» паведамляе: Рэймсу усё іщчэ пагражае апаснасьць. На жалезнай дарозе Парыж-Шалон у нікаторых мейсцах спынены рух, дзеля таго што стратэгічныя жалезнадарожныя лініі абстрэліваюцца з нямецкіх гарматаў цяжкаго калібру.

Весткі з Расіі.

— **Царыцын.** Выпушчаны с.-пад. арэшту у Владзівастоку, вядомы Іліадор, прыбыў у Царыцын на параходзе «Владімір Короленко». Вопраткі яго зашчытнаго колеру. С пад чорнай шляпы да плеч даходзюць доўгія валасы. Наагул—від цывільны пад «партыйнаго працаўніка», Разам з ім прыехала яго жана і 2 дзяцей.

Іліадора спаткала многалюдная публіка—глаўнае с кабет, Іліадор гаварыў вялікую прамову, у каторай ён, глаўным чынам павядаміў толькі аб цяжкіх варунках язды цяпер па Расіі, якіх ён нацярпеўся.

Як Іліадор сышоў с параходу, прыхільніцы паднеслі яму вялікі вянок жывых кветок. Іліадор абяцаўся, што ён па ранейшаму будзе устраіваць сходы, вясьці бяседы і інш.

Адзін з ізвозчыкаў дармо прэдставіў яму сваю дрожку.

— **Самара.** На параходах прыбывае масса селян з верхневолжскіх губэрняў—глаўным чынам з Ніжэгародзкай—уцекаючых цэлымі семьямі ад голаду. Часьць бегляцоў прабіраецца у Сыбір, часьць астаецца тут.

— **Рыбінск.** С прычыны харчавого крызысу і вялікай перапоўненасьці места насяленнем, часова ўезд у место Рыбінск забаронены.

МАСКВА. Генэрал Брусілов ранены куском гранаты у часе рэвалюцыі у Маскве, утраціу адну нагу. Баяцца, што ен памрэ. Жыве ен так бедна, што прыходзіцца зьвертацца аб дабрачынную помач.

БАЗЭЛЬ. У Бэрн прыехала у расійскае пасольство савецкая місія і загадала аддачы ей палацу пасольства. Стары пасол, Онон, адмовіуся аддаць палац. Паліцыя прымусіла савецкіх дэлегатау пакінуць пасольскі палац.

На беларускім шляху.

Украіна і Беларусь.

Як чытаем у № 144 нямецкае газэты «Vorvärts», П.Т.А. апавешчае, шчо у зьвязку з расійска-украінскімі мірнымі перэгаворамі украінскае міністэрство разглядало пытанне аб адносінах між Украінай і Беларусьсю. Украінскі урад будзе паддзержываць прынцып самаазначэння нацыянальнасьцей і з гэтай прычыны пойдзе насустрэч утварэнню этнографічнай, здольнай да жыцця Беларускай дзержавы. Аднак, с прычыны таго, што беларускі урад яшчэ аканчацельна ні установлен, а Беларускае гасударство знаходзіцца яшчэ у стане тварэння,—з ім пры мірных перэгаворах з Расіей будзе цяжка лічыцца афіцыяльна. Усеж-такі украінскі урад на мірных перэгаворах будзе бараніць жыццевыя інтарэсы Беларусі.

„Гоман“

Абразкі с правінцыі.

(Па даугінаускаму гасьцінцу)

Жыццё увайшло у нармальныя свае рамкі. Па вёсках усяліся чын чынам і пачаўся звычайны перарыў хлебаробскай працы, як заўсёды а гэтай пары. Шмат хто варочаецца дамоў з заакопнай часьці краю. Раздаюцца у пачы песьні пачлежнікаў пры вогнішчах і уладжываюцца вечарынкі. На вечарынкі прыходзюць і нямецкія салдаты, з якімі селяне здружыліся і моладзь забаўляецца і скачыць пад згукамі хрыплай гармонікі. Забаўляюцца разам і нямецкія салдаты, якіх паненкі вельмі хвалюць за дэлікатнасьць.

Пануюць вясковыя ідыліі, авеяныя арыгінальным калярытам.—Скокі напамінаюць балеты—пантаміны, бо кавалеры—немцы ні ведаюць па беларуску, а беларускі тым болей—па нямецку. Яны прымушаны рамансіраваць, як разумныя з разумнымі—на мігі.

Шкадуюць аб гэтым немцы.
Шкадуюць і беларусы.—
Шмат цікавей было-б.

Глаўны прывоз з Менску—тутун. Адно толькі кепска, што хлеб падаражэў—даходзіць да $1^1/_2$ руб. за 1 фунт.

Нікаторыя з лесапрамысьнікаў, лясныя матэрыялы якіх с пачатку вайны ляжалі па берагох прытокаў Віллі (Сьлізянка і др.) і забраныя селянамі пры большэвіцкім панстве,—пачалі абыходзіць вёскі і спаганяць назад забраныя матэрыялы.

З бабамі часта—густа даходзіць да спрэчак і бабы хапаюць за свае адвечныя ўзброі—качаргі і вілечнікі.

Роспуск польскіх легіонаў зрабіў на селян вялікае ўражэнне—яны вельмі ўзрадаваны, бо дзеі польскага войску у бабруйскім раёні—іх экзэкуцыі над селянамі страшэнна ні пакоілі хлебаробаў ўсяе Беларусі.

С. П.

* *
*

Рокат грому навальніцы,
Гук бушуючых віхроў,
Болбат чыстаі крыніцы,
Гоман птушак і лясоў,
Красак ціхі шэпт у поле.
Шэлест лозаў з асакой,
Песьня жаўранка аб волі,
Гегат гусак над рэкой,
Клёкат бусла у прасторы,
Сокат коніка ў траве,
Шум страшэнны хвалі ў моры,
Песьні жніву і касьбе:—
Усё,—краса натуры дзіўнай,—
Адбіваецца парой
У думпэ вольнай, ў песьні
сумнай,
У зыках музыкі сьвятой!

Тамбоў 19/XI 15.

Ю. Ф.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

У Месьнай Радзе.

Дума распушана 4 чэрвеня па прыказу глаунакамандуючага арміяй, як ні адпаведаючая свайму назначэнню.

Роспуск зроблены на аснове арт. 43 Гаагскай уставы аб сухапутным войску і лічбау А. І. Нямецкаго Імператорскаго указу ад 22 сьнежня 1916 г.

Замест думы установлен магістрат на камісарскіх асновах у складу: месьці галава Хржонстовскі; І. Каплан (замесьціцель галавы), грамадзянін Цывінскі (опытны дзеяч), Нэйфах, Доунар-Запольскі (старадумец), і пані Кодзіс (д-р філязофіі, старшыня пушкінскай бібліатэкі і вядомая грамадзская дзеячка).

На помач магістрату будзя створэна Рада даверанных асобау з віднейшых грамадзян места у лічбе ад 18 да 24 асобау назначенных комэндатурай на аснове прэдстаулення градоначальства.

Маршалкам Рады будзя месьці войт. Яна меціме значэнне дарадчае.

Новыя месьнія радцы п. п. Каплан і Доунар-Запольскі учора 5 чэрвеня прыймалі справы ад быушаго члена управы Зальманова.

Сэкрэтаром магістрату астаецца сэкрэтар быушай Управы п. Андрэяу.

У Юбілейным домі, перайшоушым пад кіраунiцтво беларускага народнаго прэдстауніцтва, рэмонт канчаецца на гэтым тыдні.

Рэмонт робіцца пад даглядам старшыні „Беларускай Хаты“ Ф. Вернікоускаго.

Зьезд духавенства дзеля разгляду бягучых пытанняу адміністратыуна-духоунаго быту адбудзецца у Юбілейным домі у нядзелю, 9 чэрвеня.

Аб зьняцці па рахунку водян.-элект. станцыі недаімкі у 1,500 руб. за электрычную энэргію у «Беларускай Хаце», узбуджано хадатайство перад меськ. управаю старшынею Ф. Вернікоускім.

Матыу хадатайства нідаімка, перайшоушая да «Хаты», як спатчына, ад большэвізма: б. амэрыканскаго хауруса хрысьціянскай моладзі жыушых у свой час у «Хаце» маючэй культурна-асьветнае значэнне.

Трэба спадзевацца, што меська управа пойдзе на сустрэч азначанай просьбе.

Аб зачыненні статыстычнаго бюро пры месьнай управе, як створэнаго без сур'езнай да гэтаго патрэбы, пры тым у цікар збяднеушай меськ. кассе, новы галава Хржонстоускі мае падняць пытанне у хуткім часе.

Гэты крэдыт лепей ужыць на патрэбы болей рацыянальныя.

Рээвакуацыя уцекачоу Крулеуства Польскаго, па рэгістрацыоных веешках камітэтау уцекачоу, фактычне закончылася.

У «Вэксэльштубэ» болей ні разменяюць царскіх грошэй на акупацыйныя, а так сама «керэнак» і думскіх. Цяпер толькі разменіваюць адны акупацыйныя з вялікіх на дробныя.

Абмен спыніуся раптам, раней 15 чэрвеня, як было сказано, с той прычыны, што курс царскаго рубля у самай Расіі вельмі пау, дзеля перапаунення грашавога рынку паперовымі знакамі.

Цэна на авес, каторы апошнімі часамі прадавауся выпадкова, дайшла да 35—40 руб. за пуд.

Акраінныя бедныя ізвозчыкі кідаюць свой промысел—дохнуць з голаду.

У гэтым промыслу, ма быць так сама ні абойдзецца без якой кольвечы нарміроукі са старанЫ уласьцей.

Курсы беларусазнаўства.

6 чэрвеня лекцыя праф. М. Массоніуса. «Гісторыя беларускаго языка».

Пачатак а 7 гадз.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 4 чэрвеня 1918 року.

Заходні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Артылерыйная дзеяльнасьць пераменнай сілы, павялічэнная разведачная дзеяльнасьць ворага і варожые аттакі у розных мейсцах фронту.

Група арміяу Германскаго Кронпрынца.

На поўдні рэкі Эн, мы адынялі пры страшных бітвах у ворага часьць яго акопаў. Упартае сапраціўленне ворага, трымаўшагося на вышках заходнее і поўднёва-заходнее Суассона было учора намі зломлено. Вышкі Вобнім і заходнее Шодзён былі ўзяты. Пасьля заўлады Перманом і Міссы-о-Буа мы адкінулі ворага на лінію Сульс-Доммье. Было захоплено некалькі батарэй і некалькі тысяч палонных. Францускія контраттакі па абодвых баках р. Урсі рушыліся с цяжкімі для ворага стратамі. Паўночна-заходнее Шата Тьерры мы с боем перайшлі жалезную дарогу Бюссіар-Бурэш і праціві лі варожым контраттакам. Паміж Марнай і Рэймсам становішчо без перамен.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Весткі с краю.

м. Радашковічы, Віленскай губ. Віл. павету.

Тэатральная выстава 19 мая г. г.*)

(ад нашаго дапісчыка).

19 мая г. г. тутака зноў пасьля доўгаго перарыву адбыўся тэатр уладжэны мейсцовымі сіламі. Ігралі вучні і вучаніцы вышэйшаго пачатковаго вучылішча. Першым ішоў «Міхалка». Як Міхалку [К. Сайкоўскі], так і роль Карыты [П. Вольскі] правялі саўсім добра, бяз лішняго шаржу, можа нават заспакойна. Заспакойна была і Адэля (Н. Зенкевіч): дзяўчына маючы 38 гадоў' больш пушчае форсаў, каб спадабацца маладому хлопцу, а праз гэта павінна быць у ёй больш залётнасьці і жэманства. Натуральна правяла сваю ролю Юлька (М. Немцэвіч); на сваім мейсцы быў і Зьмітрук [К. Кіцінскі]. Наогул бяручы «Міхалка» прайшоў куды лепш, чым можна было спадзевацца ад аматораў, ды ішчэ першы раз выступаючых на сцэні; больш было праўдзівасьці, чымся гэта бывае у прафэсыяналаў.

Другім ішло—«Па рэвізыі». Старшыня (І. Белановіч) і Пантурчысе (К. Кіцінскі) у сваей доўгай сцэні трудна было прыкаваць увагу нісаўсім спакойнай «галёркі». Гарасім (Л. Левіцкі) перасаліў п'янога сьведку, хоць на сцэні умее трымацца свабодна. І наогул апошняя сцэна п'янства с пісарам (Л. Аўдыцкі) выйшла крыху нінатуральна. Камічныя ролі, як і камічныя сцэны вельмі лёгка зліваюцца с шаржам і трэба моцнай рэжысэрскай рукі, каб утрымаць ад гэтаго асабліва пачаткуючых аматароў. Нішто справіліся са сваімі ролямі Параска (А. Товпека) і сторож (І. Шышко.)

Трэба адзначыць ішчэ, што для падгатоўкі тэатру было вельмі мала часу і ўсяго было 2-3 рэпэтыцыі, якія скольці мог памагаў прарэжысыраваць тутэйшы вучыцель Н. І. Шкода.

Пасьля выступалі дэкляматоры: Аўдыцкі, Белановіч, Левіцкі, Небашынскі, каторых публіка вельмі прыхільна спаткала. Была і музыка—трыо: мандаліна. балалайка і гітара, каторая пад загадам Чаеўскаго выграла напраўна некольці драбніц. У канцы выступіла сьпевацкая хоць нівялічкая дружына, але с паміж іх былі надта добрыя, чыстыя. мілыя галасы. Асабліва трэба адзначыць Браніцкую, каторая запевала «чы ні ў полі» і «камара». Такі голас можа быць аздобай у найлепшым хоры. Добры голас мае і Немцэвіч, толькі, запеваючы «чаму ж мне ні пець» на гэты раз узяла крыху за высокі для хору тон. Хор на сьпех зарганізаваў так сама Чаеўскі і хоць толькі покуль што на два галасы, але і гэта вялікая яго заслуга.

Словам, увесь вечар са сваёй рожнай праграмай зрабіў вельмі добрае і прыемнае уражэнне, і гаспадары яго—Більдзюневіч і Баран хіба павінны быць здаволяны с той сваей вялікай працы, якую яны ні паскупіліся ўлажыць.

Гурток радашкоўскай моладзі, маючы у сваім складзі такія сілы, паказаў што ён мае ні толькі права, але і абавязак сталаго свайго істнавання. Ні меншы абавязак ляжыць і на «Менскім Т-вес Беларускай Культуры» з яе аддзелам «Дырэкцыі Народнаго Беларускаго тэатру» памагчы Радашкоўскаму гуртку у сваёй арганізацыі: там ніхват кніжак, тэатральных твораў, німа нот на 4 галасы і інш. Добра зарганізованая Радашкоўская дружына магла б без вялікаго накладу ажывіць ні толькі самі Радашковічы, але і суседнія мястэчкі, як Краснае, Ракаў, Гарадок, Ільлю, Лагойск і Даўгінаво. Трэба аб гэтым ні толькі падумаць, але і зрабіць.

Н.

*) Гл. № 57

ВАСІЛІШКІ. 16 мая а поўдні перэстаў істнаваць Васілішскі пав. Часьць яго далучэна да Пляпскаго павету, а другая—да сельскаго павету Горадні.

Да сельскаго павету Горадні належыць цяпер, паміж іншых, такжэ Скідэль і Вазёры. Куды будзе прыпісана Кабіла, ішчэ ні пастаноўлено.

ВЯЛІКАЯ АЛЬШАНКА. Горадн. пав. 12 мая ў начы ў часі пажару згарэлі тут некалькі хат і будынкаў, ды многа скаціны. Здаецца, што тут быў падпал.

ГАЛОУНІЦЫ. 15 мая вёска гэта блізка ўся выгарэла. Ні гледзячы на ўсе старанні пажарніцкай дружыны, пажар трываў увесь дзень. Згарэлі 57 дамоў і 18 пунь.

ВЛАДЫСЛАВАУ. Гаспадар Шамайтіс прыйшоў у паліцыю. і заявіў, што ў яго ўкралі двое каней. Паліцыя дайшла, што ён прадаў сваіх каней за граніцу—у Прусы і каб укрыць непазволеную прадажу, удаў кражу. Яго засудзілі па 3 месяцы ў вастрог і 100 р. штрафу. Апрыч таго, ў яго сконфіскованы ўзятыя за каней грошы.

СУВАЛКІ. У дзень Божаго Цела хрысьціянскае таварыство помачы бедным арганізавало ў мястовым парку «дзень кветкі».

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **«Т-оя Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблята.